МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ»

Кафедра сацыяльна-палітычных і гістарычных навук

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ І МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПА ТЭМЕ «БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў IX ст. – першай палове XIII ст.»

для студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання ўсіх спецыяльнасцей

УДК 93(476)(07)

Метадычныя рэкамендацыі і матэрыялы для самастойнай работы па тэме «Беларускія землі ў IX ст. – першай палове XIII ст.» складзена ў адпаведнасці з праграмай курсу «Гісторыя Беларусі» (зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэспублік Беларусь 15 красавіка 2008 г.). Выданне ўключае агульныя метадычныя парады студэнтам і асноўныя патрабаванні, схемы, базавую тэрміналогію і матэрыялы рэкамендаваныя для самастойнай работы. Матэрыялы таксама разлічаны на ўсіх, хто цікавіцца пытаннямі айчыннай гісторыі.

Складальнік: Васовіч С.М., к.г.н, дацэнт кафедры СПіІН
Навуковы рэдактар: Баюра А.Н., к.г.н., дацэнт, прафесар СПіІН

Рэцэнзент: Савіч, А.А., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі славянскіх народаў установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя

Гісторыя Беларусі налічвае не адно тысячагоддзе. Яна ўяўляе сабой важную частку гісторыі еўрапейскай і сусветнай цывілізацыі. Таму кожны грамадзянін нашай краіны павінен ведаць сваю гісторыю, без якой немагчыма будаваць цяперашняе і прагназаваць будучыню. Неабходна выкарыстоўваць гістарычны вопыт, каб не паўтараць памылак, а браць з мінулага ўрокі для вырашэння сёняшніх задач.

Важнае месца у гісторыі беларускага народа займае перыяд IX ст. – першай паловы XIII ст. Гэта час, калі супольнасці ўсходнеславянскага насельніцтва – крывічы, дрыгавічы, радзімічы далі з другой паловы X ст. пачатак дзяржаўнасці на беларускіх землях. Племяннoе «княжанне» крывічоў-палачан з'явілася гістарычным ядром Полацкага княства. На аснове «княжання» дрыгавічоў у паўднёвай часцы Беларусі ўтварылася Тураўскае княства, якое мела больш цесныя сувязі з Кіевам. Значныя поспехі былі дасягнуты таксама і ў сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці тагачаснага грамадства Беларусі.

Улічваючы важнасць вышэйазначанага перыяда у развіцці беларускага народа, *студэнты*, у адпаведнасці з тыпавой вучэбнай праграмай «Гісторыя Беларусі» для вышэйшых навучальных устаноў, пры вывучэнні дадзенай тэмы *павінны ведаць:*

- прыкметы і асаблівасці феадальнай грамадска-эканамічнай фармацыі;
- сацыяльную (саслоўную) структуру сярэднявечнага феадальнага грамадства;
- фармаванне раннефеадальных дзяржаўных утварэнняў ва ўсходніх славян, асабліва на тэрыторыі Беларусі;
- дасягненні ў развіцці культуры Беларусі ў азначаны перыяд.

*Акрамя таго яны павінны ўмець:*

- характарызаваць працэс фарміравання аграрных сацыяльна-эканамічных адносін на тэрыторыі Беларусі у азначаны перыяд.
- ацэньваць значэнне Кіеўскай Русі ў гісторыі ўсходнеславянскага свету;
- характарызаваць ролю і месца Полацкага і Тураўскага княстваў у сістэме дзяржаўнасці ўсходніх славян;
- ацэньваць асноўныя дасягненні культуры насельніцтва Беларусі у кантэксце агульнаеўрапейскага культурнага працэсу.

Прапануемыя матэрыялы для самастойнай работы даюць адказы на некаторыя найбольш актуальныя і значныя пытанні, звязаныя з разглядаемай тэмай. У мэтах пашырэння пазнавальных магчымасцей студентаў, лепшага засваення імі прапануемай інфармацыі выкарыстаны структурна-лагічныя схемы, выпучаны базавыя тэрміны. Матырыялы для самастойнай работы дапамогуць студэнтам аналізаваць, абагульняць, ацэньваць гістарычныя падзеі, факты, з'явы, выяўляць паміж імі прычынна-выніковыя сувязі; абгрунтоўваць сваю думку і прымяняць гістарычныя веды пры аналізе праблем развіцця сучаснага грамадства Беларусі. Акрамя таго дапамогуць пры падрыхтоўцы да экзамену.

## Працэс узнікнення феадалізму ва Усходняй Еўропе. Асаблівасці ў фарміраванні феадальных адносін ва ўсходніх славян

***Феадалізм*** – гэта грамадскі лад, эканамічнай асновай якога з'яўляецца манапольная ўласнасць феадала на зямлю і частковая ўласнасць на залежнага селяніна.

***Сінтэзны працэс феадалізацыі*** – феадалізм развіваўся ў выніку сінтэзу «варварскіх» родаплемянных і познарымскіх рабаўладальніцкіх адносін.

***Бяссінтэзны працэс феадалізацыі*** – феадалізм развіваўся марудна, на аснове толькі родаплемянных адносін.

***Эканамічны (гаспадарчы) уклад*** – тып адносін паміж людзьмі пэўнага грамадства, які мае ў сваёй аснове тую ці іншую форму ўласнасці.

***Шматукладная гаспадарка, ці шматукладнасць*** – гэта наяўнасць і суіснаванне дзвюх і больш форм уласнасці ў якім-небудзь грамадстве. У сярэднявеччы суіснавалі тры эканамічныя ўклады: першабытнаабшчынны, рабаўладальніцкі і феадальны.

***Феод*** – зямельнае ўладанне феадала, населенае залежнымі сялянамі.

***Феадал*** – уладар зямлі (***феода***) і часткова залежных сялян, прадстаўнік пануючага класа пры феадалізме.

***«Феадальная лесвіца»*** – іерархічная сацыяльная структура класа феадалаў, якая склалася на аснове феадальнай зямельнай уласнасці.

***Палюддзе*** – збор даніны са свабоднага насельніцтва, першапачатковая форма феадальнай рэнты.

***Даніна***, або ***кармленне*** – прымусовы збор грашыма або натурай у карысць князя.

***Пагост*** – пэўнае месца, дзе князь атрымліваў даніну з мясцовага насельніцтва.

***Феадальная рэнта*** – прысваенне феадаламі вынікаў працы сялян. Яна была адработачная (паншчына), натуральная (дзяклю), грашовая (чынш).

***Эксплуатацыя*** – прысваенне прадуктаў працы іншых людзей.

***Вотчына*** – зямельнае ўладанне феадала, якое перадавалася па спадчыне.

***Верв*** – усходнеславянская суседская абшчына ў IX ст.

***Смерды*** – агульная назва залежага сялянства.

***Закуп*** – збяднелы несвабодны абшчыннік, які браў у князя ці ў яго дружыннікаў пазыку (купу), за што абавязваўся працаваць на яго гаспадарцы.

***Радовіч*** (ад слова «радзіцца», «дамаўляцца») – селянін, звязаны абавязацельствамі з феадалам.

***Ізгоі*** – сяляне, што выйшлі з абшчыны, знаходзіліся на службе ў феадалаў і поўнасцю залежалі ад іх волі.

***Халопы*** – людзі, якія поўнасцю згубілі сваю асаблівую свабоду і па сваім стане былі рабы.

***

Эканоміка амаль што кожнага грамадства шматукладная. Сукупнасць эканамічных укладаў і суадносіны паміж імі характарызуюць грамадскі лад і ступень яго развіцця. Аднак пэўная форма грамадскіх адносін заўсёды з'яўляецца пераважаючай, асноўнай. Пры гэтым больш прагрэсіўны ўклад можа стаць пануючым і ў значнай ступені вызначыць сутнасць самога ладу.

*Характэрная рыса развіцця ўсходніх славян у IX–XII стст. – шматукладная гаспадарка.* У гэты перыяд суіснавалі тры сацыяльна-эканамічныя ўклады: стары

першабытнаабшчынны, рабаўладальніцкі, які не атрымаў значнага развіцця, і новы феадальны, што пачаў нараджацца. У выніку рэшткі родаплемяннога ладу і элементы рабаўладання цесна перапляталіся з узнікаючымі раннефеадальнымі адносінамі.




*Першабытнаабшчынны (родаплемянны) уклад* быў заснаваны на абшчыннай (агульнай) уласнасці на сродкі вытворчасці (зямлю, сыравіну, розныя прыстасаванні). Толькі на некаторыя прылады працы існавала асаблівая ўласнасць членаў абшчыны. Земляробы-абшчыннікі заставаліся асноўным слоем усходнеславянскага грамадства да канца X ст. *Рабаўладальніцкі ўклад* характарызуецца ўласнасцю рабаўладальніка на сродкі вытворчасці і на работніка – раба. Ва ўсходніх славян рабаўладальніцкі ўклад значнага распаўсюджання не атрымаў, але ён існаваў тут доўга. З краін Усходняй Еўропы, у тым ліку славянскіх, у IX–X стст. вывозілася вялікая колькасць рабоў, але ў сельскагаспадарчай вытворчасці самой Кіеўскай Русі праца рабоў не атрымала шырокага распаўсюджання, асабліва ў XI–XII стст. Рабаўладанне мела патрыярхальны характар. У IX–XII стст. ва ўсходніх славян нараджаўся *феадальны гаспадарчы ўклад*. Феадальнымі з'яўляюцца такія адносіны, якія заснаваны на ўласнасці на зямлю і няпоўнай уласнасці на работнікаў – сялян. ***Феадалізацыя грамадства заключалася ў тым, што ўзнікала буйное землеўладанне і фарміравалася залежнае ад феадалаў сялянства.***




Працэс узнікнення новага грамадскага ладу – ***феадалізму*** ў раннім сярэднявеччы ішоў рознымі *шляхамі*. У шэрагу краін Заходняй Еўропы феадалізм развіваўся ў выніку сінтэзу (зліцця, спляцення) «варварскіх» родаплемянных і познарымскіх рабаўладальніцкіх адносін. Уступаючы ў кантакты з рымлянамі, «варварскія» народы запазычвалі некаторыя дасягненні рымскай тэхнікі і агракультуры: двухполле і трохполле, добрае ўгнаенне глебы, стойлавае ўтрыманне жывёлы. У заваяваных краінах «варварскае» насельніцтва са свайго боку аказвала ўплыў на развіццё вытворчых сіл. За кошт абшчыннікаў, што сюды перасяляліся, значна вырас слой свабоднага сялянства, і атрымала развіццё дробная вытворчасць, якая тады была прагрэсіўнай формай гаспадаркі.

Ад *сінтэзнага шляху* развіцця феадальных адносін адрозніваўся працэс феадалізацыі, які гісторыкі называюць бяссінтэзным. Ён праходзіў у краінах, у якіх узаемадзеянне з рымскім грамадствам было менш значнае ці адсутнічала наогул (краіны Усходняй Еўропы, уключаючы землі Беларусі). Тут станаўленне феадальных адносін ішло на аснове разлажэння родаплемяннога ладу непасрэдна ад першабытнаабшчыннага ладу.

Тут нават не было буйных гарадоў. Таму працэс узнікнення феадальных адносін быў больш замаруджаны, чым, напрыклад, у некаторых краінах Заходняй Еўропы, дзе ён праходзіў прыкладна на тры стагоддзі раней.

***Працэс фарміравання феадальных адносін***




Ва ўсходніх славян цяжка высветліць, калі канчаецца ваенная дэмакратыя і пачынаецца феадалізм, які развіваўся вельмі марудна. У генезісу феадалізму выдзяляюцца два этапа.

***Этапы генезісу феадалізму ва Усходняй Еўропе***




Для першага «давотчыннага» этапа, які ахопліваў у старажытнарускай дзяржаве Кіеўская Русь IX–XI стст., характэрны былі адсутнасць буйнога феадальнага землеўладання і панаванне дзяржаўнай формы ўласнасці, пачатак працэсу фарміравання класа феадалаў і існаванне перажыткаў родаплемяннога ладу. Аб станаўленні феадальнага гаспадарчага ўклада сведчыла эксплуатацыя дзяржавай (князем) падуладнага насельніцтва, сваіх «людзей» (адсюль паходзіць назва тэрміна «палюддзе») у выглядзе збору даніны – футра, мёда, воска і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі. Князь са сваёй дружынай адпраўляўся «ў палюддзе», гэта значыць у кругавы аб'езд абласцей, восенню, калі быў сабраны ўраджай. Тут яны «карміліся» на працягу зімы і збіралі даніну. У красавіку, калі Днепр вызваляўся ад ільду, яны ехалі ў Кіеў, а ў чэрвені везлі на лодках паклажу разам з рабамі на продаж у Канстанцінопаль. Пазней, у сярэдзіне X ст., парадак збору даніны змяніўся. Сяляне самі пачалі прывозіць яе князю ў спецыяльныя месцы – пагосты. Збіралі яе з асобных сялянскіх гаспадарак. Абкладанне свабодных абшчыннікаў данінай паказвае эканамічнае і палітычнае панаванне князёў і дружыннікаў над працаўнікамі ўжо ў IX–XI стст. Абшчыннікі-сяляне страчвалі магчымасць свабоднага карыстання даходамі са сваіх зямель, якія сталі вярхоўнай уласнасцю дзяржавы. Паступова даніна ператварылася ў феадальную рэнту.

***Этапы генезісу феадальнай рэнты***



***Паступова даніна пераўтваралася ў феадальную рэнту!***

Увогуле для феадалізму характэрна прысваенне феадаламі вынікаў працы сялян. Для указанага ладу ўласцівы тры формы прысваення феадальнай рэнты: адработачная (паншчына), натуральная (аброк ці дзякло), грашовая (чынш).

**_Формы феадальнай рэнты_**

- Паншчына (адработачная рэнта)
- Аброк (дзякло) (прадуктовая рэнта)
- Чынш (грашовая рэнта)

На чале грамадства ўсходніх славян стаялі князі і іх дружыны. Спачатку князь дзяліўся сабранай дaнінай са сваімі дружыннікамі. Затым лепшыя дружыннікі, набліжаныя да князя (іх называлі «мужы»), пачалі атрымліваць права збіраць на сваю карысць даходы з гарадоў і валасцей – так званыя «кармленні». Як адзначалася вышэй, прадстаўнікі служылай знаці спачатку не былі землеўладальнікамі. Зямля з'яўлялася дзяржаўнай маёмасцю. Хаця ёсць меркаванне аб тым, што баярства, якое вело свой пачатак з племянной знаці, магло мець уласныя зямельныя надзелы раней, чым іх атрымалі князі, якія ўзначалілі дзяржаву.

З XII ст. пачаўся другі этап у генезісе феадалізму, калі існавалі такія віды землеўладання, як княжацкае, баярскае, царкоўнае.

**_Віды феадальнага землеўладання_**

- Княжацкае
- Баярскае
- Царкоўнае

У склад княжацкага надзела уваходзілі часткі абшчынных зямель, якія яму выдзяляліся мясцовай знаццю для ўласнага карыстання, а таксама гарады, пабудаваныя па загадзе князя. Акрамя таго, князь мог захапіць і падпарадкаваць сябе землі, на якія не распаўсюджвалася ўлада родаплемяннай знаці. У выніку ў склад княжацкіх надзелаў у раннім сярэднявеччы ўваходзілі двары, гарады, сёлы, неўмацаваныя паселішчы, лясы, азёры і інш. Яны з'яўляліся асноўнай крыніцай даходаў на ўтрыманне князя, а таксама фондам зямельных надзелаў яго васалаў.

Аб царкоўным землеўладанні магчыма гаварыць толькі з таго часу, калі побач з княжацкай «дзесяцінай» на ўтрыманне царкоўных устаноў пачалі выдзяляць зямельныя надзелы. Першапачаткова царкоўныя надзелы былі невялікія. Аднак узнікненне ў XII ст. значнай колькасці манастыроў сведчыла аб паспяховым развіцці царкоўнага землеўладання.

Паступова «мужы» атрымалі назвы «добрыя», «лепшыя» і пачалі называцца баярамі. Князі давалі ім землі з сялянамі. Узніклі сядзібы феадалаў, з'явіліся баярскія сёлы. Цэнтрам сядзібы – двара феадала – было гаспадарскае жыллё. У сядзібе гаспадара таксама былі залежныя ад яго рамеснікі і слугі. Феадал выкарыстоўваў для сваёй гаспадаркі толькі частку зямлі, якая яму належала, другую частку пакідаў у карыстанне сялянам. Паселішча, якія належалі феадалам і былі населены залежнымі ад яго людзьмі, называліся сёламі. Існаванне феадальных двароў і сёл – сведчанне развіцця

феадальных адносін. Існавалі розныя формы феадальнага землеўладання: вотчыннае – валоданне зямлёй, сядзібай і сялянамі з правам продажу зямлі, падзелу яе і перадачы ў спадчыну; памеснае – перадача буйным феадалам участка зямлі ў часовае карыстанне за службу без права перадачы па спадчыне.

***Формы феадальнага землеўладання***

Вотчына | Памесце

У Заходняй Еўропе ўсталявалася складаная сістэма ўзаемаадносін паміж феадаламі. Асновай гэтых адносін была ўласнасць на зямлю, якая была галоўным багаццем. Кожны феадал валодаў феодам, атрыманым ад больш буйнога феадала на ўмовах выканання ваеннай ці адміністрацыйнай службы. Такія пазямельныя адносіны суправаджаліся асаблівай залежнасцю васала (падапечнага феадала) ад таго, хто яго апекаваў (сеньёра – буйнога землеўладальніка, які за службу атрымліваў зямлю ад караля). Такія ўзаемаадносіны паміж феадаламі называюцца «феадальная іерархія» ці «феадальная лесвіца». Сяляне, рамеснікі, гандляры не адносіліся да феадальнай іерархіі.

Ва Усходняй Еўропе «феадальная лесвіца» не склалася ў тым выглядзе, як у Заходняй Еўропе, адносіны паміж феадаламі былі прасцейшыя. На вяршыні іерархіі знаходзіўся вялікі князь, ніжэй – князі – кіраўнікі асобных зямель, яшчэ ніжэй – баяры – уладальнікі маёнткаў.

***«Феадальная лесвіца»***

| ***Заходняя Еўропа*** | ***Усходняя Еўропа*** |
|---|---|
| Кароль | Вялікі князь |
| Герцагі і графы | Удзельныя князі |
| Бароны | Баяры |
| Рыцары | ***Не склалася ў разгітай форме*** |

Захаваць сваё панаванне феадалы маглі толькі маючы ўладу і апарат прымусу – войска. Існавалі розныя рангі феадальнага войска. У войску князёў служылі феадалы, якія складалі бліжэйшае акружэнне сваіх уладароў – «старэйшую дружыну», многія феадалы мелі сваё войска, якое складалася з васальных баяр і служылых людзей, што выйшлі з абшчыны сялян.

На Русі доўга існавалі перажыткі родаплемяннога ладу. Земляробчае насельніцтва было арганізавана ў сельскую суседскую абшчыну. У славян яна называлася «верв». Гэтая назва паходзіць ад слова «вяроўка», якой адмяралі ўчастак зямлі, што належыў кожнаму члену абшчыны. Свабодных абшчыннікаў называлі «людзі». Але паступова частка з іх рознымі шляхамі трапляла ў залежны стан, іншыя заставаліся адносна свабоднымі. Буйныя землеўладальнікі захоплівалі абшчынныя землі і ператварылі іх у сваю феадальную ўласнасць. Свабодныя сяляне станавіліся феадальна залежнымі і былі абавязаны несці павіннасці на карысць сваіх паноў. Залежныя сяляне называліся

«смердамі» або «чэлядзю» (іх назва, верагодна, паходзіла ад звычая «біць чалом», гэта значыць кланяцца тварам уніз перад сваім гаспадаром). Вылучалася некалькі катэгорый залежных сялян: закупы, радовічы, ізгоі, халопы.




Грамадства сярэдніх вякоў падзялалася на некаторыя групы насельніцтва, якія мелі свае правы і абавязкі.

| *Група насельніцтва* | *Абавязкі* |
|---|---|
| Свяшчэннікі | Моляцца за ўсіх |
| Феадалы | Абараняюць усіх |
| Сяляне | Працуюць на ўсіх |
| Рамеснікі | Вырабляюць рэчы |
| Гандляры | Займаюцца гандлем |

Такім чынам, існавалі наступныя асаблівасці ўзнікнення феадалізму ва ўсходніх славян:

- характэрны бяссінтэзны працэс узнікнення феадалізму;
- у поўным аб'ёме не сфарміравалася «феадальная лесвіца»;
- у княжацкай дружыне служылі феадалы-васалы і свабодныя сяляне-абшчыннікі;
- была шматукладная гаспадарка.

## Сельская гаспадарка, гарады

Сельскагаспадарчая вытворчасць з'яўлялася асноўным відам дзейнасці ўсходніх славян. Галоўнай галіной сельскай гаспадаркі было земляробства. Найбольш распаўсюджанымі культурамі былі пшаніца, ячмень, авёс, жыта, гарох, проса. Пэўную вагу ў пасевах мелі бабовыя культуры. З X–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі вядомы лён, каноплі. З агародных культур сеялі капусту, рэпу, цыбулю, моркву, буракі, агуркі.

Існавалі розныя сістэмы земляробства. Пры павелічэнні новых ворных плошчаў мела пэўную вагу падсечна-агнявое земляробства. Існавала таксама пераложная сістэма, пры якой зямлю ў далінах рэк, на лясных палянах, суходольных лугах пераставалі апрацоўваць да аднаўлення яе натуральнай урадлівасці. Галоўным была папаравая сістэма ворнага земляробства ў форме двухполля або архаічнага трохполля.

Ворныя прылады ў сярэднявеччы рабілі з дрэва. Металічнымі былі толькі асобныя іх часткі. У IX ст. на тэрыторыі Усходняй Еўропы з'явіўся прынцыпова новы, больш дасканалы ў параўнанні з ралам, від ворнай прылады – двухзубая драўляная саха з двума металічнымі сашнікамі. Яна становіцца асноўнай ворнай прыладай у пачатку II тысячагоддзя н.э., таму што была больш прастасавана да ўмоў ляснай паласы.

Важнай галіной сельскай гаспадаркі была жывёлагадоўля з развядзеннем усіх вядомых у наш час відаў хатняй жывёлы. Асаблівасцю развіцця жывёлагадоўлі было тое, што да канца I тысячагоддзя н.э. зацвердзілася стойлавае ўтрыманне жывёлы.

Апрача сельскай гаспадаркі, насельніцтва Беларусі займалася промысламі. Самым распаўсюджаным відам промыслу з'яўлялася рабылоўства. Насілі дапаможны характар таксама паляванне, бортніцтва, збор грыбоў, ягад, іншых дзікарослых пладоў лесу. Прычым бортніцтва давала не толькі мёд, але і другі вельмі патрэбны і каштоўны прадукт – воск. Мёд, воск і футра з'яўляліся для ўсходніх славян асноўным прадметам гандлю з Візантыяй, гарадамі Прычарнамор'я. Самымі распаўсюджанымі хатнімі промысламі былі прадзенне і ткацтва, без якіх наогул нельга ўявіць жыццё сярэднявечнага грамадства.

Гаспадарчае жыццё ў Х–XIII стст. характарызавалася ўзнікненнем гарадоў. Пісьмовыя крыніцы таго часу называюць больш за 30 паселішчаў гарадскога тыпу на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Гэта Полацк (летапіс упамінае пад 862 г.), Тураў (пад 980 г.), Бярэсце, Віцебск, Менск і інш.

Узнікалі старажытныя гарады па-рознаму, але ў аснове большасці з іх былі княскія і феадальныя замкі. Прычынамі ўзнікнення гарадоў сталі аддзяленне рамяства ад земляробства, развіццё абмену прадуктамі земляробства на рэчы, што выраблялі рамеснікі, а затым і гандлю паміж рознымі раёнамі, якія спецыялізаваліся на сельскагаспадарчай і рамеснай вытворчасці. Немалаважную ролю ва ўзнікненні гарадоў адыгрывала неабходнасць абароны ад ворага.

Старажытны горад складаўся з некалькіх частак. Умацаваная валамі, рвамі, сценамі цэнтральная частка горада называлася дзядзінцам. Тут пераважна сяліліся феадалы, заможнае купецтва, духавенства. Паселішчы рамеснікаў і гандляроў, што ўзнікалі каля умацаванага цэнтра, утваралі пасад. Звычайна каля дзядзінца на беразе ракі размяшчаўся рынак. Вуліцы ў гарадах былі вузкімі і адыходзілі ў розныя бакі ад цэнтра горада.

У XII–XIII стст. гарады сталі ператварацца ў цэнтры рамяства. У гарадах існавалі некалькі дзесяткаў відаў розных рамёстваў. Найбольш распаўсюджанымі рамёствамі былі кавальства, ганчарства, гарбарства, бандарства, прадзіва і ткацтва і інш.

Гарады з'яўляліся таксама цэнтрамі гандлю. У Х–XI стст. ён насіў характар абмену. Важную ролю адыграваў замежны гандаль. Ён вёўся паміж гарадамі, размешчанымі на буйных водных магістралях. З замежных краін дастаўляліся дарагія тканіны, шкляны посуд, віно, алівкавы алей, вострыя прыправы, упрыгажэнні. Трэба адзначыць, што гандаль у Х–XIII стст. развіваўся ва ўмовах абмежаванай патрэбы ў прывазных таварах. Асноўная частка прадукцыі не ўключалася ў працэс тавараабмену. Таму у эканамічным жыцці пераважала натуральная гаспадарка. Негледзячы на тое, што гарады былі цэнтрамі як рамяства, так і гандлю, большасць гарадскіх жыхароў усё ж займаліся земляробствам (значнага тавараабароту паміж горадам і вёскай не існавала).

Такім чынам, у IX ст. – першай палове XIII ст. на тэрыторыі Беларусі ў сельскай гаспадарцы пачалі выкарыстоўваць больш інтэнсіўныя тэхналогіі земляробства (двухполле і нават трохполле). У выніку развіцця вытворчых сіл, аддзялення рамяства ад сельскай гаспадаркі ўзніклі і паспяхова развіваліся гарады.

## Аб'яднанні ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі

*Протанароднасці* – народнасці, якія пачалі фарміравацца.

***

На тэрыторыі Беларусі ў VIII – Х стст. сфарміраваліся некалькі аб'яднанняў усходніх славян: дрыгавічы, крывічы-палачане, радзімічы. Яны ўяўлялі з сябе не плямёны ці саюзы плямён, а давалі ўстойлівыя этнічныя або этнаграфічныя супольнасці (про-

танароднасці), у аснове якіх ляжалі не столькі родаплемянныя, колькі тэрытарыяльныя, эканамічныя і палітычныя сувязі. Гэтыя супольнасці былі аб'яднаны не толькі адноснай агульнасцю гаспадарча-культурнага жыцця, тэрыторыяй, але і адзінай уладай. Таму яны адначасова былі пачатковымі дзяржаўнымі ўтварэннямі тэрытарыяльна-палітычнага характару ці прадзяржавамі (протадзяржавамі) – «княжаннямі». У той жа час утварэнне такіх супольнасцей садзейнічала ўзмацненню моўных і культурных сувязей паміж асобнымі плямёнамі, іх змешванню.

***Аб'яднанні ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі***

Полацкія крывічы | Дрыгавічы | Радзімічы

*Крывічы-палачане* рассяліліся па цячэнні Заходняй Дзвіны (займалі тэрыторыю сучаснай Віцебскай вобласці, а таксама некаторыя суседнія раёны). Яны сфарміраваліся у выніку асіміляцыі прышлымі славянамі мясцовых усходніх балцкіх плямён. Назву «крывічы» даследчыкі выводзяць па-рознаму. Адны мяркуюць, што гэта назва паходзіць ад прозвішча старэйшага рода Крыў (Крыва), другія – ад слова «крэўныя», што значыць «блізкія па крыві», трэція – ад імя язычніцкага першасвяшчэнніка Крыва – Крывейтэ, чатцёртыя – ад перасечанай, узгоркаватай мясцовасці. У летапісе крывічы названы пад 859 г. На тэрыторыі Беларусі галоўным цэнтрам іх быў горад Полацк. Менавіта па назве горада старажытныя летапісцы называлі «палачанамі» тых крывічоў, якія пасяліліся у вярхоўі Заходняй Дзвіны, дзе знаходзіцца сутока Палаты. У полацкіх крывічоў існавала сваё «княжанне».

Паўднёвымі суседзямі полацкіх крывічоў былі *дрыгавічы*, якія жылі паміж Прыпяццю і Дзвіной. Найбольш распаўсюджана думка, што назва «дрыгавічы» паходзіць ад слова «дрыгва» (балота), пасярод якой яны і жылі. Выказваюцца меркаванні, што найменне «дрыгавічы» ўтварылася ад асабовага імя, напрыклад, Драг ці Драгавіт.

Паўночная граніца рассялення дрыгавічоў праходзіла у сярэдняй Беларусі, прыкладна па лініі гарадоў Мінск – Заслаўе – Барысаў. Тут знаходзілася паласа змяшэння дрыгавічоў з крывічамі. Галоўным дрыгавіцкім горадам з'яўляўся Тураў.

Дрыгавічы знаходзіліся на высокім узроўні сацыяльнага развіцця. Аб гэтым сведчыць існаванне свайго «княжання» яшчэ да ўключэння ў склад Кіеўскай Русі ў X ст., вылучэнне дрыгавіцкіх зямель у Тураўскае княства пры першым жа падзеле Кіеўскай Русі Уладзімірам Святаслававічам у 988 г. У апошні раз дрыгавічы названы ў летапісе пад 1149 г.

*Радзімічы* – усходнеславянская этнічная супольнасць, якая пасялілася на рацэ Сож. Назву радзімічы атрымалі ад імя свайго родавага правадыра Радзіма, на чале з якім яны прыйшлі з прапольскіх (ляшскіх) зямель. Найбольш значным горадам у землях радзімічаў быў Гомель.

У радзімічаў існавала свая племянная вярхушка і ваенная арганізацыя. Амаль да канца X ст. радзімічы жылі самастойна і толькі часова выплочвалі даніну спачатку хазарам (Хазарскаму каганату), а потым кіеўскаму князю. Яны былі падпарадкаваны Уладзміру Святаслававічу. У летапісу радзімічы названы ў апошні раз пад 1169 г. як этнаграфічная адзінка ўсходняга славянства.

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі ў раннім сярэднявеччы сфарміраваліся некалькі этнічных супольнасцей, а менавіта полацкія крывічы, дрыгавічы, радзімічы, якія стаялі на высокім узроўні сацыяльнага развіцця. У крывічоў і дрыгавічоў нават існавалі свае «княжанні».

## Раннефеадальныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі

***Нарманская тэорыя*** – канцэпцыя, згодна з якой нарманы (варагі) з'яўляліся заснавальнікамі Старажытнарускай дзяржавы.

***Нарманы*** (ад сканд. northman – паўночны чалавек) – скандынавы, удзельнікі гандлёва-грабежніцкіх і заваявальных паходаў у Еўропу ў канцы VIII ст. – сярэдзіне XI ст. Ва ўсходніх славян яны называліся варагамі.

***Княжанне*** – прамежкавая стадыя паміж саюзам плямён і дзяржавай, «зародкавая» форма дзяржаўнасці; тэрмін, якім у «Аповесці мінулых гадоў» абазначаны грамадскі лад некаторых усходне-славянскіх племенных аб'яднанняў.

***Протадзяржава*** – дзяржава, якая пачынае ствараццa.

***

Да ўтварэння Старажытнарускай дзяржавы – Кіеўскай Русі – у дрыгавічоў і полацкіх крывічоў існавалі самастойныя мясцовыя «княжанні». Для «княжанняў» былі характэрны наступныя рысы:

1) наяўнасць князёў (княжацкай улады); правіцелі пачатковых дзяржаўных утварэнняў мелі нават тытул – «светлы князь»;

2) наяўнасць ваеннай арганізацыі (дружыны);

3) існаванне сістэмы ўмацаваных паселішчаў-градаў (гарадоў);

4) існаванне сістэмы падаткаабкладання, права.

Мясцовыя «княжанні» ўяўлялі з сябе пачатковую форму дзяржаўнасці на Русі. Таму нельга звязываць пачатак дзяржаўнасці ва ўсходніх славян з прызваннем нарманаў (варагаў). Пры гэтым трэба улічваць, што запрашэнне на княжанне было звычайнай практыкай у эпоху сярэднявечча, і не яно вызначала характар дзяржаўных утварэнняў.

Паступова з мэтай сумеснай барацьбы супраць іншаземных захопнікаў розныя «княжанні» усходніх славян аб'ядналіся ў два палітычныя саюзы. На поўначы для барацьбы з варагамі быў створаны саюз «Славія» з цэнтрам у Ноўгарадзе. Яго склалі чудзь, славене, мера, крывічы. На поўдні для змагання з Хазарскім каганатам была арганізавана «Куява» з цэнтрам у Кіеве. Існуе меркаванне, што радзімічы і дрыгавічы цягацелі да паўднёвага саюзу. Трэба заўважыць, што міжусобіца паміж славянскімі землямі дазваляла варагам і хазарам часам абкладаць славян данінай.

У 882 г. Алег здолеў аб'яднаць паўднёвы і паўночны саюзы славян у адну дзяржаву са сталіцай у Кіеве – Кіеўскую Русь. Ён таксама падпарадкаваў і абклаў данінай радзімічаў, якія да гэтага плацілі даніну хазарам.

| Куява (паўднёвы саюз) | + | Славія (паўночны саюз) | = | Кіеўская Русь (у 882 г. Алегам) |
|---|---|---|---|---|

У выніку аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель Полацк і землі, якія яму падпарадкоўваліся, сталі знаходзіцца ў пастаянных палітычных і эканамічных сувязях з Кіеўскім княствам (Полацкае княства увайшло ў склад Кіеўскай дзяржавы). Пры гэтым Полацк у пачатку X ст., верагодна, быў не даннікам, а саюзнікам Кіева. Мясцовыя князі і

полацкая знаць дзейнічалі, абапіраючыся на кіеўскага вялікага князя. Паводле міру, заключанага паміж Кіеўскай дзяржавай і Візантыяй у 907 г., частка даніны ішла ў Полацк ад грэкаў, пацярпеўшых паражэнне. Гэта сведчыць аб тым, што адносіны паміж Полацкам і Кіевам абмяжоўваліся стасункамі, якія прадугледжвалі ўдзел полацкага князя ва ўзаемавыгадных ваенных мерапрыемствах. У першай палове X ст. Полацкае княства наогул выходзіць з-пад улады Кіева.

Полацкае княства склалася на аснове племяннога «княжання» крывічоў-палачан. Яго цэнтрам з'яўляўся горад Полацк, які згадваецца ў летапісе «Аповесць мінулых гадоў» пад 862 г. Першым гістарычна вядомым полацкім князем быў Рагвалод, які прыйшоў «з-за мора». Ён быў зусім незалежным правіцелем. У 980 г. ён і два яго сыны былі забіты, а дачка Рагнеда прымусова стала жонкай Уладзіміра Святаслававіча (вядомы у гісторыі пад імем «Краснае Сонейка», або Уладзімір-Хрысціцель). Полаччына зноў увайшла ў склад Кіеўскай Русі. Увогуле пры князі Уладзіміры Кіеўская дзяржава дасягнула свайго найвышэйшага росквіту. Было амаль завершана аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель.

Утварэнне Кіеўскай Русі з'яўлялася заканамерным вынікам сацыяльна-гістарычнага развіцця ўсходнеславянскіх зямель у VI–XI стст. Выдзяляюцца пэўныя прычыны утварэння гэтай дзяржавы.




Кіеўская Русь уяўляла з сябе раннефеадальную дзяржаву – манархію на чале з Вялікім князем Кіеўскім. Трэба адзначыць, што старажытнаруская дзяржава не была адзіным цэнтралізаваным дзяржаўным утварэннем (існавала як адносна адзіная дзяржава толькі да пачатку XII ст.). Яна сфарміравалася як федэрацыя феадальных княстваў, кожнае з якіх захоўвала адносную самастойнасць і самабытнасць. Князі асобных зямель, якія ўваходзілі ў склад Кіеўскай Русі, знаходзіліся у васальнай залежнасці ад вялікага князя. Яны абавязаны былі пастаўляць вялікаму князю воінаў, а іх падуладнае насельніцтва – плаціць даніну.

**_Прыкметы ўтварэння раннефеадальнай дзяржавы_**

- Існаванне ўлады князя і яго дружыны
- Наяўнасць падуладнай князю тэрыторыі з насельніцтвам
- Існаванне заканадаўства
- Абкладанне падаткамі для ўтрымання прадстаўнікоў дзяржаўнай улады

Розныя тэрытарыяльныя адзінкі Кіеўскай Русі вядомы былі пад назвамі «воласць», «зямля», «вобласць». Эканамічныя і этнічныя сувязі паміж імі не былі трывалымі. Асновай адзінства Кіеўскай Русі з'яўлялася моцная ваенная арганізацыя, якая дазваляла не толькі абараняцца ад ворагаў, але рабіць заваявальныя паходы ў суседнія багатыя краіны і трымаць пэўны час у падпарадкаванні мясцовых князёў і баяр, схільных да сепаратызму. У першай палове XII ст. Кіеўская Русь канчаткова распалася на самастойныя княствы. Русь перажывала перыяд феадальнай раздробленасці.

**_Прычыны феадальнай раздробленасці_**

- Развіццё земляробства і рамёстваў ва ўмовах панаваня натуральнай гаспадаркі
- Рост гарадоў – эканамічных і палітычных цэнтраў асобных феадальных зямель
- Павелічэнне колькасці вотчын, пашырэнне правоў феадалаў на валоданне зямлёй
- Рост эканамічнай магутнасці мясцовых феадалаў
- Прызначэнне князем сваіх сыноў у якасці намеснікаў для кіравання валасцямі. Стварэнне мясцовага апарату кіравання ў вотчынах
- Рост ваеннай магутнасці мясцовых феадалаў , якая стварала ілюзію магчымасці самастойна абараніцца ад знешніх ворагаў

Феадальная раздробленасць з'явілася заканамерным этапам гістарычнага развіцця. У час феадальнай раздробленасці ствараліся лепшыя магчымасці для асваення зямель і прыродных рэсурсаў, росту гарадоў, развіцця земляробства і рамёстваў. Гэта ў сваю чаргу садзейнічала таварнай вытворчасці, эканамічнаму і палітычнаму збліжэнню паасобных зямель. У той жа час у перыяд феадальнай раздробленасці значна памяншалася ваенная магутнасць дзяржаў. Асобныя княствы не маглі супрацьстаяць сур'ёзнай знешняй небяспецы.

Пасля няўдалага замаха на жыццё Уладзіміра Рагнеда з сынам Ізяславам была выслана ў Полацкую зямлю. Уладзімір не выступіў супраць гэтага, бо ў адпаведнасці з яго адміністрацыйнай рэформай ён накіроўваў іншых сваіх сыноў у буйныя гарады ў якасці намеснікаў. Полацкая знаць запрасіла Ізяслава княжыць у Полацку, бо горад не мог заставацца без свайго князя. Так была ўзноўлена мясцовая дынастыя полацкіх князёў.

Полацкія князі пасля смерці Ізяслава знаходзіліся ў асобным становішчы ў параўнанні з іншымі нашчадкамі Уладзіміра. Яны страцілі права на кіеўскі прастол, бо Ізяслаў памёр раней за свайго бацьку – Уладзіміра.

***Радавод полацкіх князёў***




Пры ***Брачыславе*** палачане атрымалі два населеныя пункты, якія кантралявалі волакі паміж Заходняй Дзвіной і Дняпром, на шляху «з варагаў у грэкі» – Віцебск і Усвяты. Атрымаўшы кантроль над волакамі, Полацкае княства эканамічна замацавала сваю незалежнасць. Акрамя таго, Брачыслаў падтрымліваў крывіцкую каланізацыю і распаўсюджванне сваёй улады на балцкія плямёны. Былі далучаны землі паміж Заходняй Дзвіной і Дзісной, дзе на месцы старажытнага паселішча крывічоў быў пабудаваны па загадзе князя горад Браслаў. Пад уладу Полацка трапіла таксама Менская воласць. Такім чынам, у перыяд княжання Брачыслава Полацкае княства вырасла тэрытарыяльна і замацавала сваю незалежнасць эканамічна праз усталяванне кантролю над волакамі каля Віцебска і Усвят.

Пасля смерці Брачыслава ў 1044 г. трон у Полацку заняў яго сын ***Усяслаў*** (якога празвалі Чарадзеем), які сем месяцаў нават быў Вялікім князем Кіеўскім (у 1068–1069 гг.). Пры ім улада Полацкага княства ўмацавалася на тэрыторыі Ніжняга Падзвіння. Былі заснаваны Герцыке і Кукенойс. Увогуле у час княжання Усяслава адносіны паміж

палачанамі і балцкімі плямёнамі насілі мірны характар. У час княжання Усяслава адбыўся перанос дзядзінца Полацка да берага Заходняй Дзвіны, будаўніцтва Сафійскага сабора. Абараняючы эканамічныя інтарэсы свайго княства, Усяслаў у 1065 г. напаў на Пскоў, а у 1066 г. захапіў, абрабаваў і часткова спаліў Ноўгарад. Гэтыя дзеянні выклікалі працяглую барацьбу паміж Яраславічамі (трыма сынамі кіеўскага князя Яраслава Мудрага) і полацкім князем Усяславам. У перыяд гэтага супрацьстаяння ўпершыню прыгадваецца горад Менск (цяперашні Мінск) у 1067 г. Нягледзячы на шэраг паражэнняў, Усяслаў Чарадзей захаваў цэласнасць і палітычную незалежнасць Полацкага княства – першай дзяржавы на беларускіх землях (толькі з 1067 г. па 1071 г. Полацкая зямля знаходзілася у залежнасці ад Кіева). Дзякуючы працягламу княжанню (57 гадоў) Усяслава, Полацкая зямля ў адрозненне ад астатніх усходнеславянскіх княстваў, дзе з другой паловы XI ст. пачаўся актыўны падзел на ўдзелы, заставалася цэласнай дзяржавай з адзіным цэнтрам у Полацку. Лічыцца, што пры Усяславе Чарадзею Полацкае княства дасягнула найвышэйшага ўздыму.

Пасля смерці Усяслава Полацкае княства распалася на шэраг асобных удзельных княстваў. Пачаўся перыяд феадальнай раздробленасці. Прастол у Полацку лічыўся галоўным, і гэты горад працягваў заставацца самым буйным палітычным цэнтрам, старшым горадам Полацкай зямлі.

***Удзельныя княствы Полацкай зямлі***




Пасля смерці Усяслава паміж яго сынамі адбывалася міжусобная барацьба, у якую ўмешваліся іншыя князі. Феадальная раздробленасць і бясконцыя княжацкія сваркі аслаблялі Полацкую зямлю. У той жа час адносіны паўднёварускіх князёў з Полацкам у першай трэці XII ст. працягвалі заставацца вельмі вострымі. У 1129 г. кіеўскі князь Мсціслаў захапіў у палон амаль усіх полацкіх князёў і саслаў іх з семьямі у Візантыю да свайго зяця імператара Іаана II. Там полацкія князі служылі ў войску, якое ваявала супраць арабаў. Але ў 1132 г. (пасля смерці Вялікага князя Кіеўскага Мсціслава) полацкае веча выбрала сваім князем прадстаўніка полацкага княжацкага дому – Васільку. На пачатку 40-х гг. XII ст. уся Полацкая зямля, за выключэннем Копысі, зноў апынулася пад уладай мясцовай дынастыі нашчадкаў Усяслава. Нягледзячы на федальную раздробленасць, Полацкая зямля працягвала заставацца дастаткова моцнай дзяржавай у першыя дзесяцігоддзі XIII ст.

Другім значным раннефеадальным княствам на беларускіх землях было Тураўскае, якое прымыкала да паўднёвых граніц Полацкай зямлі і знаходзілася на тэрыторыя паўднёвай Беларусі ў басейне Прыпяці. Тэрыторыя гэтай дзяржавы фарміравалася на землях, заселеных дрыгавічамі. Тураўскае княства было спадкаемцам тэрыторыі, насельніцтва, гістарычных традыцый, культуры, узроўню эканамічнага і сацыяльнага развіцця «княжання» дрыгавічоў.

Палітычныя межы Тураўскага княства супадалі з тэрыторыяй рассялення дрыгавічоў. Аднак яно ўнаследавала не ўсю іх тэрыторыю. Пры фарміраванні Тураўскай дзяржавы адбыліся тэрытарыяльныя страты дрыгавіцкіх зямель. Так, тэрыторыя ў паўночных рэгіёнах рассялення дрыгавічоў ужо ў X–XI стст. апынулася за межамі Тураўскай зямлі і адыйшла да Полацкага княства. Правабярэжжа Дняпра ў наваколлі Рэчыцы разам з гэтым горадам увайшлі у склад Чарнігаўскага княства. Брагін, размешчаны ў кампактнай зоне рассялення дрыгавічоў, палян і севяран, застаўся у складзе Кіеўскага княства.

Тэрыторыя Тураўскага княства ў XI ст. мела значныя памеры – ад Дняпра і Заходняга Буга – каля 500 км і ў напрамку з поўдня на поўнач ад правабярэжжа Прыпяці да граніц з Полацкім княствам – ад 200 да 300 км. У далейшым памеры княства мяняліся, плошча яго скарачалася. Стабільнымі заставаліся паўночная і ўсходняя граніцы княства, значна змяняліся яго заходнія і паўднёвыя граніцы.

Першапачатковым палітычным цэнтрам Тураўскай зямлі (княства, воласці) быў Тураў, які ўпершыню ўпамінаецца ў летапісе пад 980 г. Назва горада звязвалася з першым летапісным князем – Турам. Пры Уладзіміры Тураўская зямля ўвайшла ў склад Кіеўскай дзяржавы.

Сярод княстваў Старажытнай Русі Тураўскае княства займала даволі значнае месца: Тураў размяшчаўся на Прыпяці, якая з'яўлялася водным шляхам на Захад. Важнасць Тураўскага княства ў той час пацвярджалася яго прыналежнасцю старэйшай лініі Яраславічаў і той акалічнасцю, што менавіта з Тураўскай зямлі некаторыя князі пераходзілі на кіеўскі вялікакняжацкі прастол (у 1054 г. – Ізяслаў, у 1093 г. – Святаполк).

У 1157 г. Тураў захапіў Юрый Яраславіч (з рода Ізяславічаў) – заснавальнік тураўскай княжыцкай дынастыі. У 1158 і 1160 гг. ён вытрымаў аблогі кіеўскага князя і яго саюзнікаў. У 1162 г. Кіеў прызнаў незалежнасць Тураўскага княства; была адноўлена самастойнасць Тураўскай зямлі. У Тураве усталявалася самастойная княская дынастыя. У той жа час за Кіевам заставаліся гарады Мазыр і Брагін.

У XII ст. адбыўся падзел Тураўскага княства. Удзельныя дробныя княствы трапілі ў залежнасць ад галіцка-валынскіх князёў.

***Драбленне Тураўскай зямлі ў XII – пачатку XIII ст.***



Пасля аднаўлення Тураўская зямля не магла вярнуць сваё былое вялікае значэнне. Прычынай гэтаму было ўмацаванне суседніх магутных княстваў – Чарнігаўскага, Галіцкага, Уладзіміра-Валынскага.

Тураўскае княства актыўна ўдзельнічала ў агульных мерапрыемствах, што арганізоўвалі і праводзілі кіеўскія князі. Асаблівай рысай палітычнага жыцця Тураўскай зямлі пасля яе драблення з'явіліся мірныя, сапраўды брацкія адносіны князёў Юр'евічаў.

Паўднёва-ўсходнія раёны Беларусі, населеныя радзімічамі, канчаткова ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі ў 984 г. На працягу XI ст. адбывалася адзяржаўленне радзімічаў – замена суверэнітэта мясцовых князёў на суверэнітэт Рурыкавічаў, упарадкаванне падаткаабкладання і хрысціянізацыя.

У другой палове XI ст. землі радзімічаў (па ніжнім цячэнні Сожа на паўднёвы ўсход ад Рагачова і невялікая тэрыторыя на правым беразе Дняпра) папалі пад уплыў Чарнігаўскага княства, якое знаходзілася на паўднёвым ўсходзе ад Полацкай дзяржавы. Трэба адзначыць, што большая частка Чарнігаўскага княства размяшчалася на тэрыторыі сучаснай Украіны. Цэнтрам яго быў горад Чарнігаў. Але у перашай палове XII ст. за землі радзімічаў пачалася барацьба паміж Чарнігаўскім і Смаленскім княствамі. Смаленскае княства займала тэрыторыю ў верхнім цячэнні Дняпра і Заходняй Дзвіны. Аб'яднаўшы пад сваёй уладай дняпроўскіх крывічаў, Смаленскае княства распаўсюдзіла яе на заходніх вяцічаў, якія жылі ў вярхоўях Акі, а потым і на землі паўночных радзімічаў. Спачатку Смаленская зямля па развіццю адставала ад Полацкай, аднак у другой палове XII ст. стала адным з самых вядомых княстваў на землях усходніх славян.

У 1127, 1142 гг. князь Расціслаў Мсціславіч – родапачынальнік дынастыі смаленскіх князёў, зрабіў паходы супраць чарнігаўскага князя з мэтай далучэння да Смаленскага княства паўночных зямель радзімічаў. У выніку гэтых паходаў былі далучаны Крэчут, Прупой і міжрэчча Іпуці і Бесядзі. На часцы далучаных Расціславам зямель ім былі заснаваны ўласныя даменіяльныя ўладанні, цэнтрамі якіх сталі гарады Мсціслаў, Расціслаў, Ізяслаў, названныя ім так у гонар свайго бацькі, сябе і брата.

Тэрыторыя Сярэдняга або Беларускага Пабужжа ўключае ў сябе землі, якія ляжаць у басейне сярэдняга цячэння Заходняга Буга і яго прытокаў (Мухавец, Лясная, Рыта). З далёкай старажытнасці Буг з'яўляўся асноўнай воднай магістраллю рэгёна. Наяўнасць гандлёвага шляху становуча адбілася на развіцці эканамічных адносін і грамадскага ладу Сярэдняга Пабужжа, важным палітычным і стратэгічным цэнтрам якага з'яўляўся г. Бярэсце (найбольш раннія звесткі пра Бярэсце у летапісах адносяцца да 1017 г.).

З пачатку XI ст. г. Бярэсце ўваходзіў у склад Тураўскага княства. Уяўляя важнасць і значэнне Сярэдняга Пабужжа, кіеўскія князі неаднаразова вялі барацьбу за гэтыя землі з польскімі каралямі, а потым і з валынскімі князямі. У другой палове XII ст. Бярэсце ўвайшло ў склад Уладзіміра-Валынскага княства. На працягу XII–XIII стст. летапісы адзначаюць спробы Бярэсця стаць самастойным цэнтрам асобнага ўдзела, але гэтага не удалося.

Трэба адзначыць, што этнічнай мяжы паміж Падляшшам і астатняй часткай Берасцейскай зямлі не існавала на працягу многіх стагоддзяў. Гэтыя тэрыторыя, аб'яднаная вакол свайго галоўнага горада Бярэсця, складала даволі адзіную ў сацыяльна-палітычных адносінах вобласць.

Што тычыцца Верхняга Панямоння, то пісьмовыя крыніцы не паведамляюць, якія плямёны тут жылі ў VI–XII стст., таму што гэты рэгён быў перыферыяй ўс-

ходнеславянскай каланізацыі. Але дадзеныя археалогіі сведчаць, што ў канцы I і пачатку II тысячагоддзяў н.э. славянскае насельніцтва было тут дамінуючым, дрыгавіцка-крывіцкім. Славяне заснавалі свае гарады на ўзвышшах, якія да гэтага ніхто не засяляў. Усе гарады ўзніклі ў асяроддзі сельскіх паселішчаў, у месцах, дзе былі найбольш спрыяльныя ўмовы для заняткаў земляробствам. У XI ст. на аснове паселішчаў, якія ўзніклі пры асваенні славянамі Верхняга Панямоння, пачынаюць фарміравацца раннегарадскія цэнтры ў Гародні, Наваградку, Ваўкавыску, Слоніме, крыху пазней – у Турыйску.

Гарады першапачаткова выконвалі функцыі адначасова і памежных крэпасцей, і адміністрацыйных цэнтраў, і княжацкіх сядзіб (замкаў). Працэс станаўлення ўсходнеславянскіх гарадоў у Верхнім Панямонні адбываўся да канца XI ст. У наступныя стагоддзі назіраўся іх сапраўдны росквіт. Амаль ўсе яны сталі цэнтрамі асобных княстваў. У Верхнім Панямонні (так званай «Чорнай Русі») узніклі Гарадзенскае, Наваградскае, Ваўкавыскае, Слонімскае, Свіслацкае ўдзельныя княствы. Можна думаць, што мелі сваіх князёў і іншыя гарады, якія, такім чынам, з'яўляліся цэнтрамі паасобных удзелаў. Аднак усе яны шчыльна прымыкалі да Наваградка, князь якога, магчыма, для ўсіх іх меў значэнне вялікага князя. Цэнтральнае значэнне Наваградка і вызначыла назву гэтай зямлі як Наваградскай. Пры гэтым летапісы не зарэгістравалі ніводнага выпадку міжусобнай барацьбы яе князёў.

***Гістарычныя формы дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі***

Племянныя «княжанні»

⇩

Раннефеадальная дзяржава – Кіеўская Русь

⇩

Асобныя княствы-воласці

⇩

Удзельныя княствы

Такім чынам, крывічы-палачане і дрыгавічы напярэдадні ўтварэння Кіеўскай Русі мелі свае «княжанні», або протадзяржавы, якія ўзніклі на падставе разлажэння першабытнаабшчыннага ладу. Развіццё феадальных адносін ва ўсходніх славян садзейнічала складванню княжацкай улады на падставе новай феадальнай стуктуры грамадства, фарміраванню сталай дынастычнай улады князей. На змену племянным «княжанням» прыйшлі раннефеадальныя княствы. Першымі з якіх на тэрыторыі Беларусі былі Полацкае і Тураўскае, каторыя нейкі час уваходзілі ў склад феадальнай федэратыўнай дзяржавы-манархіі з моцнай ваеннай арганізацыяй – Кіеўскую Русь. У складзе Кіеўскай Русі яны заставаліся цэльнымі землямі. Абапіраючыся на незалежніцкія імкненні і падтрымку мясцовага насельніцтва, Полацкія і Тураўскія землі праз нейкі час сталі незалежнымі. У іх зацвердзіліся свае пастаянныя дынастыі князёў. У XII ст. – першай палове XIII ст. Полацкае і Тураўскае княствы перажывалі заканамерны перыяд свайго развіцця – феадальную раздробленасць. Што тычыцца радзімічаў, то яны не здолелі стварыць сваю дзяржаву. Іх землі ў XI–XIII стст. уваходзілі ў склад Смаленскага і Чарнігаўскага княстваў. Таму гісторыя Пасожжа непасрэдна была звязана з падзеямі, якія адбываліся на асноўнай тэрыторыі вышэйадзначаных княстваў.

## Дзяржаўны лад у землях-княствах

***Веча*** (ад слова «вяшчаць» – гаварыць) – сход гараджан для вырашэння найбольш важных грамадскіх і дзяржаўных спраў.

***Ваявода*** – у Старажытнай Русі і іншых славянскіх краінах начальнік княжацкай дружыны або кіраўнік народнага апалчэння.

***Дружына*** – войска князя; спецыяльна обучаны ваеннай справе ўзброены атрад людзей.

***Князь*** – прадстаўнік вышэйшай арыстакратыі ў славян і некаторых іншых народаў, уладар княства.

***Пасаднік*** (ад слова «пасадзіць» – назначыць, выбраць, паставіць) – намеснік князя, які кіраваў вобласцю, збіраў даніну.

***

Важная роля ў арганізацыі ўлады ў раннесярэднявечным горадзе і яго воласці належала князю. Князь лічыўся главой княства. Адсутнасць князя парушала нармальнае жыццё княства.




***Абавязкі князя:***

1. Займаўся вайсковай справай: арганізоўваў войска і ўзначальваў ваенныя сілы, ажыццяўляў ваенныя паходы ў суседнія землі.
2. Клапаціўся пра бяспеку і абарону княства. Ахоўваў гандлёвыя шляхі і караваны ў сваім княстве.
3. Кіраваў знешняй палітыкай, зносінамі з іншымі князямі і дзяржавамі (мог аб'явіць вайну і заключыць мір).
4. Збіраў даніну і іншыя паборы з насельніцтва для ўтрымання ваеннай дружыннай арганізацыі і іншых дзяржаўных патрэб.
5. Ажыццяўляў суд і адміністрацыйнае (унутранае) кіраванне дзяржавай.
6. Раздаваў воласці на чале з гарадамі іншым князям-васалам.

Дзяржаўная ўлада ў Полацкім княстве на працягу XI ст. пераходзіла да старэйшых у родзе сыноў памёршага князя. Саперніцтва паміж імі не існавала, бо нашчадкі ў полацкіх князёў тады былі адзінкавыя. Пасля смерці Усяслава Чарадзея наступіў перыяд феадальнай раздробленасці. Быў зменены прынцып размеркавання ўладанняў паміж князямі. Удзелы князёў вылучаліся толькі з тых гарадоў і валасцей, што ўваходзілі ў апошні ўдзел іх бацькі (гэты ўдзел лічыўся вотчынай яго сыноў).

Полацкія князі лічылі самі сябе Рагвалодавічамі па жаночай лініі і бацькаўшчыну сваю вялі не ад падаравання Уладзіміра, а па лініі спадчыны ад Рагвалода. Прадстаўнікі мясцовай полацкай княжыцкай дынастыі былі непасрэднымі нашчадкамі Усяслава Брачыславіча. Увогуле ўсе полацкія князі былі з мясцовай княжыцкай дынастыі. Толькі ў 1067–1071 гг., 1129–1132 гг. Полацкае княства знаходзілася ў руках іншых кланаў (у 1067–1071 гг. – Ізяславічаў, у 1129–1132 гг. – Манамахавічаў).




Князі кіравалі ў імя інтарэсаў знаці. Разам з тым яны ажыццяўлялі дзейнасць на патрэбу ўсяго народа. Апорай княжацкай улады была ваенная дружынная арганізацыя. Дружына служыла князю і была яму асабіста адданая. Дружыннікі акружалі князёў, падзялялі ўсе іх інтарэсы, бо знаходзіліся на іх утрыманні.

***Кіраванне дзяржавай князем***




Княжацкую ўладу істотна абмяжоўвала веча, якое было пачатковай формай гарадскога самакіравання, ў той ці іншай ступені падуладнага мясцовай знаці. У пачатку XII ст. роля веча ўзрасла настолькі, што яно актыўна вырашала пытанні вайны і міру, запрашала на трон у Полацк князёў і нярэдка праганяла іх з горада. Вечавы сход не толькі выбіраў князя і ўраднікаў (урадцаў, службоўцаў), але кантраляваў іх дзейнасць, здзяйсняў вышэйшы суд, зацвярджаў законы, прымаў пастановы, якія рэгулявалі гаспадарчыя і грамадска-прававыя адносіны.

Веча мела сваю ўзброеную сілу – апалчэнне гараджан. Трэба адзначыць, што выступіць супраць апалчэння гараджан князь не мог са сваёй невялікай дружынай.




Гаспадарамі на вечы быў мясцовы патрыцыят, асабліва баярства. З дапамогай веча феадальная арыстакратыя, рамеснікі і гандляры абмяжоўвалі ўладу князя ў сваіх інтарэсах.

***Ажыццяўленне кантроля над князем у Полацкім княстве***




Што тычыцца Тураўскага княства, то там у грамадска-палітычным ладу былі наступныя асаблівасці.

1. Як у Ноўгарадзе, існавала пасада княжацкага намесніка – пасадніка. Калі тураўскі князь станавіўся на чале Кіеўскай дзяржавы, ён назначаў у Тураў пасадніка. Пасаднік працягваў дзейнічаць нават тады, калі князь зноў вяртаўся ў Тураў. Знаходжанне ў горадзе аднача́сова князя і пасадніка – з'ява незвычайная для іншых беларускіх гарадоў.
2. У Тураве існавала пасада тысяцкага. Тысяцкі ўзначальваў гарадское апалчэнне.
3. Калі ў іншыя гарады епіскап назначаўся кіеўскім мітрапалітам, то у Тураве гараджане мелі права голаса пры назначэнні епіскапа. Таксама актыўна дзейнічала веча.

***Параўнанне грамадска-палітычнага ладу ў Полацкім і Тураўскім княствах***

***Полацкае княства*** ***Тураўскае княства***

*Сістэма кіравання*






У Бярэсці не ўтварылася свая дынастыя князёў. Горад часамі знаходзіўся пад пратэктаратам больш моцных суседзяў: спачатку Турава, потым Кіева і Уладзіміра-Валынскага. Да Бярэсця таксама праяўлялі зацікаўленасць польскія князі.

У Бярэсці існавала пасада ваяводы і дзейнічала веча, якому фактычна належала ўлада ў горадзе і з сілай якога былі вымушаны лічыцца як валынскія, так і польскія князі. Таму Бярэсце карысталася значнай самастойнасцю.

Такім чынам, у Полацку, як, бадай, і ў іншых княствах Беларусі, было двоеўладдзе ў сферы сацыяльна-палітычнага жыцця. Вечавы лад існаваў побач з княжацкай уладай.

## Барацьба з іншаземнымі захопнікамі

У ніжнім цячэнні Заходняй Дзвіны жылі лівы, латгалы, куршы і земгалы. Лівы і латгалы з даўніх часоў плацілі даніну полацкім князям і пастаўлялі ім дапаможныя войскі. Задоўга да з'яўлення тут немцаў у ніжнім цячэнні Дзвіны знаходзіліся гарады-крэпасці Кукенойс і Герцыке, якімі кіравалі васалы полацкага князя.




У канцы XII ст. нямецкія купцы, рыцары і святары высадзіліся ў вусці Заходняй Дзвіны. Пад выглядам распаўсюджвання каталіцкай веры сярод мясцовага насельніцтва рыцары імкнуліся захапіць Ніжняе Падзвінне.

### *Этапы захопу крыжакамі Ніжняга Падзвіння*

Дзейнасць нямецкіх місіянераў
Мейнарда ў 1186–1196 гг.,
Бертольда ў 1196–1198 гг.

↓

Узведзенне ў 1201 г. крэпасці Рыга – цэнтра дзейнасці манахаў-каталікаў у Прыбалтыцы.

↓

Арганізацыя ў 1202 г. ордэна Мечаносцаў

↓

- Ваенныя сутычкі з Полацкам
  1203 г. – пачатак адкрытай вайны з Полацкам
- Узвядзенне невялікіх мураваных крэпасцей на землях насельніцтва Прыбалтыкі

↓

Выцясненне Полацка з Прыбалтыкі
- у 1208 г. рыцары захапілі Кукунойс
- у 1209 г. рыцары абрабавалі і спалілі Герцыке
- у 1212 г. полацкі князь адмовіўся ад Ніжняга Падзвіння і ад даніны з яго насельніцтва

### *Прычыны няўдалай абароны Полацкам сваіх уладанняў у Ніжнім Падзвінні*

Прычыны паражэння Полацка у барацьбе за Ніжняе Падзвінне
- Недаацэнка ўлачатку Полоцкам небяспекі крыжацкай агрэсіі
- Адсутнасць паслядоўнасці і прадуманасці ў палітыцы Полацка ў адносінах да агрэсараў
- Адсутнасць адзінства прыбалтыйскіх плямёнаў у барацьбе з крыжакамі
- Адсутнасць упачатку адзінага саюза суседніх усходнеславянскіх зямель ў барацьбе з Ордэнам.
- Перавага ўзбраення рыцараў

Такім чынам, палачане першымі з усходніх славян уступілі ў адкрытую барацьбу супраць агрэсіі нямецкіх крыжакоў, адбіваючы іх «націск на ўсход». Няўдачы Полацка ў абароне сваіх уладанняў у Ніжнім Падзвінні з'явілася вельмі балючым ударам для Полаччыны, у выніку якога яна была адрэзана ад мора. У той жа час барацьба з

крыжакамі не была дарэмная для Полацка. Яго гераічнае супраціўленне не дапусціла ворага ў карэнныя землі палачан.

Большая частка тэрыторый Беларусі не зведала мангола-татарскай навалы ў 1238–1241 гг. У 1239–1240 гг. манголы-татары прайшлі па тэрыторыі Чарнігаўскай зямлі, у склад якой уваходзілі паўднёва-ўсходнія раёны сучаснай Беларусі. Але мангола-татары рабілі набегі на беларускія землі у больш позні час.

*Прычыны абыхода манголамі асноўнай тэрыторыі Беларусі*

- Аслабленне войск Батыя барацьбой з паўночна-ўсходнімі рускімі княствамі
- Нежаданне захопнікаў ісці ў беларускія лясы і балоты пасля ўкраінскіх прастораў
- Полацкая і Смаленская землі ў XIII ст. былі даволі моцнымі ў ваенных адносінах

Такім чынам, асноўная тэрыторыя Беларусі не трапіла пад мангола-татарскі пагром 1237–1241 гг., і беларускія землі пазбеглі ярма Залатой Арды ў сярэдзіне XIII ст.

## Культура Беларусі ў X–XIII стст.

***Язычніцтва, паганства*** (ад лац. paganus – язычнік) – рэлігійныя вераванні, заснаваныя абагаўленні розных сіл прыроды.

***Хрысціянізацыя насельніцтва*** – пераўтварэнне хрысціянскай рэлігіі ў складаную частку духоўнага светапогляду, светаўспрымання насельніцтва, распаўсюджванне хрысціянскай абраднасці ў вытворча-гаспадарчай дзейнасці і побыце, скасаванне язычніцкіх культаў.

***Епархія*** – царкоўна-тэрытарыяльная акруга, якой кіраваў епіскап.

***Пергамент*** – спецыяльна выробленая тонкая скура маладых жывёл, якая ужывалася для пісьма.

***Летапіс*** – гістарычна-літаратурны твор з апісаннем падзей па гадах.

***Дойлідства*** – тое ж, што архітэктура.

***Раманскі стыль*** (франц. roman, ад лац. Romanus – рымскі) – стыль сярэднявяковага заходнееўрапейскага мастацтва, які развіваўся пад моцным уздзеяннем рымскіх традыцый. Атрымаў распаўсюджанне ў X–XIII стст. Раманская архітэктура вызначалася суровасцю, выкарыстаннем масіўных, цяжкіх форм. У выяўленчым мастацтве пераважала экспрэсіўная трактоўка сюжэтаў, адлюстраванне ў роспісах, рэльефах, кніжных ілюстрацыях магутнага і грознага Бога.

***Готыка*** (франц. gothique ад назвы германскага племені – готаў) – стыль у еўрапейскім мастацтве XII–XV стст. Выяўленчае мастацтва эпохі готыкі вызначалася падпарадкаванасцю вертыкальнаму рытму архітэктурных форм, выцягнутымі прапорцыямі, дынамізмам, увасабленнем у алегарычнай форме ідэі грахоўнасці чалавека.

***Фрэска*** – роспіс вадзянымі фарбамі па свежай тынкоўцы.

***

Характэрнай прыкметай X–XIII стст. з'яўлялася цеснае перапляценне культуры з рэлігійнымі вераваннямі. Культура старажытных беларускіх зямель мела шмат агульнага з культурай іншых усходнеславянскіх народаў. Гэта агульнае выяўлялася ў стылі, спосабе ўпрыгожвання арнаментам прадметаў прыкладнога мастацтва. Але пры ўсёй агульнасці культуры Старажытнай Русі на тэрыторыі Беларусі яна мела спецыфіку.

***Перадумовы прыняцця хрысціянства.***

1. Знаёмства з хрысціянствам воінаў, якія ўдзельнічалі ў паходах на Візантыю.

2. Неабходнасць усталявання княжацкага адзінаўладдзя.

3. Неабходнасць цеснай сувязі з іншымі дзяржавамі, якія ў той час станавіліся хрысціянскімі.

На Беларусь хрысціянства пачало пранікаць яшчэ ў IX ст., але пануючай рэлігіяй стала толькі ў канцы XII – пачатку XIII ст.

***Асаблівасці распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі:***

1. Хрысціянства на беларускія землі даходзіла як з Візантыі, так і з паўночнага захаду (Скандынавіі).

2. Калі ў Рымскай імперыі хрысціянства развівалася знізу – ад нізоў да вярхоў, урада, эліты, то ў славян яно насаджалася зверху – ад эліты да народа.

3. Хрысціянства на тэрыторыі Беларусі ўводзілася не гвалтоўна і не насільна, як у Кіеўскім княстве.

4. Хрысціянства у X–XIII стст. не выцесніла язычніцтва, а напластавалася на яго, прывяло да двухвер'я.

5. Пэўны час хрысціянства на землях Полацкага княства, маючы непасрэдныя зносіны з Візантыяй, духоўна не падпарадкоўвалася кіеўскаму мітрапаліту.

Было выбрана хрысціянства ўсходняга ўзору, таму што у тыя часы Канстанцінопаль меў несумненнае першынство ў культуры (славяне лічылі Царград цэнтрам міру); у Візантыі існавала літургічная літаратура на мове славян (царкоўнаславянскай).

Хрысціянства на Беларусі было прынята прадстаўнікамі вышэйшай знаці ўслед за афіцыйным увядзеннем яго ў Кіеве (афіцыйнае прыняцце хрысціянства па візантыйскаму абраду адбылося ў 988 г. пры князе Уладзіміры Святаслававічы). Пасля яно пачало паступова распаўсюджвацца сярод іншых пластоў грамадства. Новая вера на беларускіх землях распаўсюджвалася павольна і павінна была вытрымаць барацьбу з язычніцтвам. Простае насельніцтва, пасля таго як прынімала хрысціянства, доўгі час працягвала пакланяцца язычніцкім багам, выконваць язычніцкія абрады, прытрымлівацца язычніцкіх уяўленняў і вераванняў. У XI–XIII стст. на Русі нават працягвалі функцыянаваць язычніцкія свяцілішчы. Суіснаванню язычніцкай і хрысціянскай вер садзейнічала тое, што суседзямі нашых продкаў былі балцкія плямёны, у якіх высокага развіцця дасягнула шматбожжа. Політэістычная вера не стварала ніякіх перашкод для веры хрысціян, бо прызнавала не аднага Бога, а шмат. Таму хрысціянства фактычна выклікала ***двухвер'е*** – з'яву, калі з хрысціянствам перапляталіся розныя формы больш ранніх вераванняў. Двухвер'е на Беларусі ахоплівала X–XIII стст.

| | | |
|---|---|---|
| | Пашырэнне хрысціянства | |
| Існаванне язычніцтва X ст. | | XIII ст. |

Двухвер'е

Пасля прыняцця хрысціянства ў буйных гарадах і княствах пачалі ствараліся епархіі. У Полацку епархія узнікла ў 992 г. (трэцяя пасля Кіеўскай і Наўгародскай), у Тураве – у 1005 г. (у духоўным падпарадкаванні тураўскага епіскапа знаходзілась Бярэсце), у Смаленску – у 1137 г. Адкрываюцца цэрквы і манастыры. Напрыклад, у Полацку ў XII ст. існавала не менш 10 культавых манументальных збудаванняў, тры манастыры. У Тураўскім княстве першым манастыром быў Лешчынскі пад Пінскам. Ён быў заснаваны Уладзімірам Святаслававічам.

Свецкая улада садзейнічала царкве. Царква атрымлівала ад князёў дзесятую частку дзяржаўных даходаў і, акрамя таго, значныя зямельныя ўладанні.

***Прыняцце хрысціянства мела важныя станоўчыя вынікі:***

1. Хрысціянства, як рэлігія, агульнапрынятая ў Еўропе, яшчэ больш наблізіла землі Беларусі да цэнтральнаеўрапейскіх і заходнееўрапейскіх дзяржаў і Візантыі. У выніку значна ўзрос аўтарытэт княстваў Беларусі (з імі, як з роўнымі, пачалі лічыцца іншыя хрысціянскія дзяржавы), пашырыліся і паглыбіліся палітычныя і культурныя узаемасувязі з іншымі краінамі.

2. Сувязі з хрысціянскімі краінамі, асабліва з Візантыяй, садзейнічалі развіццю рамяства і гандлю, у першую чаргу знешняга.

3. Хрысціянства садзейнічала далейшаму паспяховаму развіццю феадальных адносін, ідэалагічнаму умацаванню адзінства дзяржаў-княстваў, розных сацыяльных слаёў грамадства і усталяванню манархічнага дзяржаўнага ладу (хрысціянская вера адпавядала адзінаўладдзю князя ў дзяржаве; хрысціянскае вераву чэнне сцвярджала, што ўсякая ўлада ад Бога).

4. З хрысціянствам звязана ўвядзенне і пашырэнне пісьменнасці. У XI ст. у полацкай зямлі асвойвалася кірылічная азбука (яе склалі для старабалгарскай мовы ў 863 г. браты Кірыла і Мяфодзій).

5. Знаёмства з візантыйскай культурай з'явілася стымулам для развіцця адукацыі, літаратуры, выяўленчага мастацтва, архітэктуры. З прыняццем хрысціянства зараджаецца каменна-цаглянае будаўніцтва, узвядзенне манументальных культавых пабудоў. Пры цэрквах і манастырах адкрываліся школы, перапісваліся кнігі.

6. Палепшаўся маральны стан грамадства (хрысціянскія запаведзі садзейнічалі ўсталяванню добрых адносін паміж людзьмі). З прыняццем хрысціянства зніклі такія заганы язычніцтва, як кроўная помста, мнагажонства, ахвярапрынашэнне, у тым ліку людзей.

7. Хрысціянства садзейнічала кансалідацыі старажытнарускага народа. Страчвалася плямянная самасвядомасць (этнонім «дрыгавічы» у апошні раз у летапісу прыгадваецца пад 1149 г., «крывічы» – пад 1162, «радзімічы» – пад 1169). Узнікае адзіная этнічная самасвядомасць для ўсіх ўсходніх славян. Яны называюць сябе агульным імем – «рускія».

Такім чынам, у выніку прыняцця хрысціянства быў зроблены вялікі крок уперад у культурным развіцці. На працягу стагоддзяў хрысціянская царква аказвала плённы ўплыў на духоўнасць культуры беларускага народа.

Вянцом матэрыяльнай культуры на беларускай зямлі было дойлідства. Спачатку помнікі дойлідства будаваліся з дрэва, а пасля прыняцця хрысціянства – з цэглы і каменю. У X–XI стст. храмы будавалі пераважна майстры, запрошаныя з Візантыі. Яны прынеслі на старажытнарускія землі традыцыі канстанцінопальскага будаўніцтва (раманскі стыль).

Першым мураваным храмам на тэрыторыі Беларусі быў грандыёзны Сафійскі сабор у Полацку (слова Сафія азначае «Боская мудрасць», якая, па ўяўленню веруючых, кіравала сусветам). Гэта быў трэці храм такога тыпу, пабудаваны на землях усходніх славян пасля Кіеўскай і Наўгародскай. Ён быў узведзены ў 50-х гг. XI ст. пры князю Усяславе Брачыслававічу. Меў сем (пяць) купалоў. Гэта была не толькі культавая, але і грамадская пабудова. Там размяшчаліся архіў, бібліятэка, дзяржаўная казна. Полацкая Сафія была сімвалам незалежнасці.

На Беларусі склаліся дзве архітэктурныя школы: полацкая і гродзенская. Асаблівасці полацкай школы: вежападобны выгляд цэркваў, невядомы візантыйскаму дойлідству, з кілепадобнымі какошнікамі ўверсе; цэнтрычна-пірамідальная кампазіцыя архітэктурных форм; сцены складваліся з прыроднага каменю і плінфы (плоская цэгла) ў тэхніцы паласатай муроўкі (што стварала чырвона-белую гаму паверхні). Асаблівасці полацкай школы характэрны для полацкай Спаса-Еўфрасінеўскай царквы (была пабудавана па замове Еўфрасінні Полацкай за 30 тыдняў дойлідам Іаанам), Барысаглебскай царквы ў Бельчыцах.

Акрамя полацкай школы дойлідства, ў XII ст. склалася яшчэ адна самабытная школа дойлідства – гродзенская. Яна была больш лакальная і ахоплівала Гародню і Ваўкавыск. Адметнымі рысамі гродзенскай школы з'яўляюцца цагляная роўнарадовая муроўка, незвычайная планавая структура і своеасаблівая дэкарыроўка фасадаў. Сцены ўпрыгожваліся ўстаўкамі з каляровага паліраванага каменю і каляровымі паліванымі керамічнымі пліткамі. У верхняй частцы сцен умуроўвалася вялікая колькасць галаснікоў (керамічныя збаны), якія выконвалі трайную функцыю: аблягчалі будаўнічыя канструкцыі, паляпшалі акустыку і дадаткова дэкаратыўна аздаблялі інтэр'ер. Найбольш характэрнымі помнікамі гродзенскай школы былі Барысаглебская (Каложская) і Ніжняя (на тэрыторыі дзядзінца) цэрквы ў Гародні, недабудаваны Ваўкавыскі храм.

У канцы XII ст. манументальнае культавае будаўніцтва старажытнай Беларусі практычна прыпыняецца. Гэта было звязана з тым, што пачаўся працэс драблення княстваў на невялікія ўдзелы. Пастаянная пагроза нападу з боку татар і крыжакоў, міжусобіцы прывялі да перавагі абарончых збудаванняў. У апошняй чвэрці XIII ст. у Камянцы была ўзведзена пяціярусная вежа (30-мятровы «Камянецкі стоўп»), пабудаванная дойлідам Алексам паміж 1276 і 1288 гг. Яна была пабудавана з жоўтай і карычневай цэглы. Яе сцены мелі таўшчыню 2,5 м. Ёсць звесткі пра тое, што такія вежы былі ў Гародні, Тураве, Наваградку і, магчыма, у Полацку. Гэтыя збудаванні адлюстроўвалі ўжо новы этап манументальнага дойлідства, звязаны з уплывам традыцый ранняй готыкі (будаўніцтва з брусковай цэглы, выкарыстанне ў дэкоры стрэльчатых вокнаў і ніш). Усяго на тэрыторыі Беларусі выяўлена і даследавана 25 мураваных помнікаў культавай і грамадзянскай архітэктуры XI–XIII стст.

Такім чынам, з усталяваннем хрысціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі пачынаецца гісторыя манументальнага дойлідства Беларусі. Мураванае дойлідства беларускіх зямель развівалася ў рэчышчы архітэктурнага працэсу ўсяго ўсходнехрысціянскага свету і спалучала ў сябе шэраг арыгінальных асаблівасцей.

Прыяцце і пашырэнне хрысціянства на Беларусі спрыяла развіццю не толькі дойлідства, але і мастацтва. На фарміраванне мастацкай культуры аказалі ўплыў таксама і поліэтнічны склад насельніцтва, функцыянаванне вялікага воднага шляху "з варагаў у грэкі", стварэнне дзяржаўнасці, узнікненне гарадоў, пачатак выцяснення племяннай свядомасці насельніцтва тэрытарыяльна-дзяржаўнай.

Адначасова з каменнымі будынкамі ў жыццё і мастацтва ўсходніх славян увайшоў манументальны жывапіс. Яго прызначэннем у храме была ілюстрацыя хрысціянскага вучэння і Евангелля. Жывапіс быў дапаўненнем да царкоўнага рытуалу. Ён наглядна ілюстраваў праз мастацкія вобразы хрысціянскае веравучэнне. Таму сцены кожнай святыні ўнутры абавязкова ўпрыгожваліся фрэскамі. Прычым роспісы рабіліся ў візантыйскай манеры і паводле візантыйскіх канонаў. Роспісы захаваліся толькі на двух помніках: фрагментарна ў Сафійскім саборы і практычна цалкам у царкве Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

З пачаткам кнігапісання нараджаецца такая галіна жывапіснага мастацтва, як кніжная графіка. Тагачасная кніга была не толькі крыніцай ведаў, але і творам мастацтва каліграфіі, жывапісу, залатарства. Жывапіснае аздабленне старажытных рукапісаў выяўлялася ў афармленні ініцыялаў, заставак і канцовак, у мініяцюрах. У цэлым рукапісы XI–XIII стст. афармляліся ў візантыйскім стылі. У іх аздабленні выкарыстоўваліся нескладаныя геаметрычныя і раслінныя элементы.

Шырокае развіццё на беларускіх землях атрымала прыкладное мастацтва. Насельніцтва Беларусі аздабляла нават звычайныя рэчы штодзённага ўжытку, якія задавальнялі чыста утылітарныя патрэбы. Рэчы упрыгожваліся геаметрычным арнаментам, расліннымі кампазіцыямі, фігурамі людзей, птушак, жывёл, фантастычных істот. Прадметы, якія прызначаліся феадальнай арыстакратыі, заможным гараджанам, часта ўпрыгожваліся выявамі фантастычных звяроў і птушак, выкананымі ў асаблівай манеры – «звярыным стылі». Любімымі сюжэтамі старажытнарускага прыкладнога мастацтва былі геральдычныя львы.

Найкаштоўнейшым творам прыкладного мастацтва Беларусі таго перыяда з'яўляецца крыж Еўфрасінні Полацкай, створаны мясцовым майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. Памер крыжа – 51 см у даўжыню, 1,5 см у таўшчыню. Паверхня пакрыта залатымі пласцінамі, а бакі – сярэбранымі. На залатых пласцінах змешчаны выявы святых, выкананыя рознакаляровымі эмалямі. Апрача эмаляў, парадны бок крыжа аздаблялі каштоўныя камяні, а па перыметры ён быў абведзены шнуркам перлаў. У крыжы захоўваліся першазначныя хрысціянскія рэліквіі, атрыманыя з Канстанцінопаля (напрыклад, кроў Хрыста, што засталася на распяцці, частка ад каменнай труны Багародзіцы, кавалачак ад каменя з труны Ісуса, мошчы св. Панцеляймона і інш.).

Апрача Лазара Богшы на беларускіх землях працавала вялікае мноства майстроў-ювеліраў. Старажытнабеларускія залатары выкарыстоўвалі наступныя тэхналогіі: ліццё, коўка, плаўка, ціСненне, залачэнне, пляценне, зернь, скань, перагародчатая эмаль, гравіроўка, інкрустацыя металамі, шклом, каштоўнымі і напаўкаштоўнымі камянямі. Для стварэння прадметаў хатняга побыту выкарыстоўваліся і іншыя металы: жалеза, бронза, медзь.

Інтэнсіўнае храмавае будаўніцтва садзейнічала развіццю вытворчасці дэкаратыўнай керамікі. Керамічныя падлогі былі абавязковым элементам храмаў і аздаблялі не толькі мураваныя, але і драўляныя бажніцы. Прыкладна ў сярэдзіне XII ст. на тэрыторыі Беларусі складваецца своеасаблівая сістэма афармлення керамічных падлог, якая

прыкметна вылучалася на фоне суседніх рэгіёнаў. Падлога ўспрымалася ўся як адно цэлае – шыкоўны трохколеравы дыван. Пліткавыя майстэрні далі імпульс для вытворчасці маёлікавага і паліванага посуду, побытавых рэчаў, дробнай пластыкі: напрыклад, місак, збанаў, падсвечнікаў.

Да XI–XII стст. адносіцца ўзнікненне арыгінальнай дробнай пластыкі. Найбольш цікавым відам пластыкі XII–XIII стст. з'яўляюцца абразкі. Іх выраблялі з бронзы, косці і каменю. Частка абразкоў была зроблена па візантыйскіх і кіеўскіх узорах. Трэба адзначыць: старажытнабеларуская школа пластыкі выдавочна адрознівалася ад усіх рэгіянальных школ на абшарах усходніх славян актыўнай асіміляцыяй, творчай адаптацыяй розных мастацкіх патокаў. Менавіта ў гэтай сферы мастацтва, як ні ў якой іншай, моцна адчувалася ўздзеянне заходнееўрапейскай стылістыкі. Увогуле развіццё манументальнага жывапісу, кніжнай графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дробнай пластыкі старажытных зямель Беларусі ў XI–XIII стст. адбывалася ў рэчышчы візантыйскай традыцыі.

Пісьменства з'явілася на Беларусі даволі рана – у X ст. Доказам гэтаму служаць старажытнейшы надпіс на пячатцы полацкага князя Ізяслава, знойдзеныя шматлікія пісьмовыя прылады – пісалы. Да XII ст. пісьменства распаўсюдзілася амаль сярод усіх слаёў грамадства таго часу. Пісьменнымі ў старажытных гарадах былі не толькі прадстаўнікі духавенства і знаці, але і простыя гараджане.

Выдатнымі помнікамі пісьменнасці з'яўляюцца розныя эпіграфічныя матэрыялы (так званыя «Барысавы» і «Рагвалодавы» камяні – у Падзвінні іх вядома дзевяць; доўгі надпіс на крыжы Еўфрасінні Полацкай; графіці полацкай Спаскай царквы Еўфрасіннеўскага манастыра; надпісы на праслачках, амфарах). У Берасце знойдзены грэбень з самшыта, на якім паслядоўна размешчаны славянскія літары ад «а» да «л». Гэты алфавіт выразаны ў пачатку XIII ст. Грэбень выконваў ролю «буквара» для навучання грамаце.

Выключную навуковую каштоўнасць маюць берасцяныя граматы – сярэднявечныя лісты. На тым баку бяросты, які прылягаў да дрэва, літары надрапвалі пісалам. Знойдзены берасцяныя граматы ў Віцебску і Мсціслаўлі.

У першай палове XI ст. пачалося летапісанне. Летапісцы праяўлялі цікавасць да падзей, якія адбываліся ва ўсіх усходнеславянскіх землях. У пачатку XII ст. Нестарам (манахам Кіева-Пячорскага манастыра) была створана «Аповесць мінулых гадоў» – першы ўсходнеславянскі летапісны звод. У ім змяшчаліся ўнікальныя звесткі з гісторыі беларускіх зямель. Летапісанне вялося ў XII–XIII стст. у буйных гарадах. Ёсць звесткі аб існаванні Полацкага летапісу, які страчаны ў XVIII ст. Не дайшоў да нас таксама Смаленскі летапіс. Летапісныя запісы, магчыма, вяліся ў Тураве і Наваградку.

Рукапісных царкоўных кніг XI–XIII стст. таксама захавалася няшмат. Вядомы Тураўскае і Полацкае Евангеллі таго часу. Самае ранняе – Тураўскае Евангелле, створана на беларускіх землях у XI ст.

Кнігі пісалі на пергаменце. Рукапісы складалі ў сшыткі. Вокладкамі да іх служылі дзве дошкі. Такая кніга мела выгляд скрыні. Пераплёт каштоўных рукапісаў аздабляўся металічнымі ўпрыгожаннямі. Каб лісты кнігі не камячыліся, дошкі-вокладкі сцягваліся металічнымі засцежкамі. Розныя засцежкі ад старажытных кніг XII–XIII стст. знойдзены ў Менску, Друцку, Ваўкавыску, Наваградку. Перапісам кніг займаліся спачатку пісьменныя людзі: адукаваныя манахі, князі, а пасля з'явіліся пісцы-прафесіяналы. Яны працавалі ў

так званых скрыпторыях – майстэрнях рукапісных кніг у манастырах. Пісалі так званым уставам: буйнымі, прасталінейнымі і нязвязанымі літарамі з роўнай адлегласцю паміж імі і асобнымі словамі. Кнігі былі рэдкай і дарагой з'явай, даступнай толькі багатым людзям і такім установам, як царква і манастыры.

Асноўную масу кніг складалі рэлігійна-дыдактычныя творы. Была распаўсюджана перакладная літаратура, першымі творамі якой былі кнігі Свяшчэннага Пісання (кананічныя кнігі). Сярод шматлікіх відаў і жанраў некананічнай царкоўна-рэлігійнай літаратуры найбольшае распаўсюджанне мела агіяграфічная літаратура. Гэта царкоўная літаратура, у якой апісваецца жыццё святых, подзвігі і пакуты кананізаваных царквой людзей. На Беларусі такая літаратура вядома з канца XII ст.: «Жыціё і хаджэнне Еўфрасінні Полацкай», «Жыціе Кірылы Тураўскага», «Слова пра манаха Марціна». У XIII ст. бытуе «Жыціе Аўрамія Смаленскага». Вяршынай мастацкай літаратуры старажытнай Русі лічыцца твор «Слова аб палку Ігаравым», у якім ёсць цікавыя звесткі аб полацкіх князях.

Такім чынам, у X–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі шырока была распаўсюджана пісьменнасць. Высокага ўзроўня дасягнула літаратура, якая адлюстроўвала багацце духоўнага жыцця ўсходніх славян.

У разглядаемы перыяд актыўна займаліся асветніцкай дзейнасцю наступныя дзеячы: у Полацку – князёўна Еўфрасіння, у Тураве – Кірыла Тураўскі, у Смаленску – Клімент Смаляціч і Аўраамій Смаленскі.

***Еўфрасіння Полацкая (1104(1110)–1167(1173) гг.).*** Дачка полацкага князя Георгія Усяславіча (унучка Усяслава Чарадзея), мела імя Прадслава. У юнацтве стала манашкаю, прыняўшы імя Еўфрасінні. Пасяліўшыся ў келлі Сафійскага сабора пры бібліятэцы пачала перапісваць кнігі, а грошы ад іх продажу аддавала бедным людзям. У канцы 20-х гг. XII ст. у якасці ігуменні заснавала каля Полацка жаночы манастыр пры Спаскай царкве, пры якім адкрыла школу для навучання грамаце дзяцей. Замест драўлянай пабудавала каля 1160 г. каменную царкву святога Спаса (цяпер Спаса-Еўфрасіннеўская). Пазней падаравала Спаскай царкве дарагі крыж, выкананы па асабістым заказе і яе эскізам ювелірам Лазарам Богшам. Заснавала яшчэ і мужчынскі манастыр, якому падаравала Эфескі вобраз Божай Маці, прывезены з Візантыі. Асветніца надавала вялікую ўвагу духоўнаму самаўдасканаленню і вучыла вернікаў і вучняў цярплівасці і душэўнай чысціні, павазе да старэйшых, любові да тых, хто побач. Дзякуючы дзейнасці Еўфрасінні, полацкая Сафія стала важным цэнтрам духоўнай культуры Беларусі, а сабраная асветніцай бібліятэка дала магчымасць атрымаць добрую адукацыю многім пакаленням палачан. Еўфрасіння Полацкая – першая жанчына з Усходняй Еўропы, якая была кананізавана ў святыя. Яе мошчы знаходзяцца ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры з 1910 г.

*Кірыла Тураўскі* (каля 1130–1182) вядомы як пісьменнік, выдатны прамоўца, прапаведнік, царкоўны дзеяч. Нарадзіўся ў Тураве ў багатай сям'і. Па жаданню гараджан быў пастаўлены епіскапам у сваім горадзе. З таго часу пачалася яго пісьменніцкая дзейнасць. Яму належаць 8 «слоў», або павучэнняў, 2 прытчы (іншасказальнае апавяданне з павучальнай высновай), 2 казанні пра манскі чын і ангельскі вобраз, 2 пасланні (да Васіля ігумена Пячорскага), 32 спавядальныя малітвы і 3 каноны (царкоўнае песнапенне ў пахвалу святога, самога свята і да т.п.). Усё гэта дае поўнае права лічыць Кірылу Тураўскага першым вялікім мастаком слова, першым пісьменнікам

еўрапейскага ўзроўню, які жыў і тварыў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Творы Кірылы Тураўскага карысталіся вялікай папулярнасцю на землях усходніх славян і ўвайшлі ў залаты фонд старажытнай літаратуры. Сучаснікі называлі Кірыла Тураўскага «ўсея Русі Златавуст». Кірыл настойліва раіў шукаць лагоднасць, якая ёсць «маці мудрасці, і розуму, і добрай думкі, і ўсім добрым справам». Ён заклікаў адкінуць гордасць, непакорнасць, гнеў, варожасць, ўсялякую злосць. Апошнія 4 гады жыцця правеў у адасобленай келлі ў манастыры, дзе і памер. За гэты подзвіг стоўпніцтва далучаны да ліку святых.

*Клімент Смаляціч* – выдатны царкоўны дзеяч і пісьменнік. З 1147 г. да 1154 г. быў мітрапалітам у Кіеве, дзе абараняў незалежнасць усходнеславянскай праваслаўнай царквы ад Візантыі. Напісаў шмат твораў, але захаваўся толькі адзін з іх «Пасланне Фаме прасвітару». Як сцвярджае Іпацьеўскі летапіс, Клімент Смаляціч «быў кніжнік і філосаф, які́х у Рускай зямлі не бывала».

*Аўрамій Смаленскі (Працалюбівы)* – царкоўны прапаведнік і кніжнік. У канцы XII – пачатку XIII ст. карыстаўся вялікім аўтарытэтам у насельніцтва зямель сучаснай Беларусі. Яго казанні прыцягвалі слухачоў не толькі са Смаленска, але і з іншых мест. Быў настаўнікам не толькі для манаскай браціі, але і для недухоўных асоб. 50 год свайго жыцця правёў у манастыры і нястомна прапаведваў рэлігійнае пакаянне. Заклікаў смалян няўхільна прытрымлівацца маральных прынцыпаў хрысцыянства, клапаціцца пра духоўнае ўдасканаленне жыцця. Толькі дзякуючы незвычайнай вытрымцы, стойкасці, высакароднасці, Аўрамій змог атрымаць маральную перамогу над лютай нянавісцю, публічнымі здзекамі, асмяяннем зайздроснікаў. За актыўнае прапаведванне хрысціянства і ўзорнае жыццё праваслаўная царква кананізавала яго.

Увогуле імёны большасці асветнікаў не захаваліся ў народнай памяці, і вялікая колькасць таленавітых твораў не дайшла да нас. Але нават тое нямногае, што збераглося, дае падставы сцвярджаць: выдатныя царкоўныя дзеячы сваімі творамі ўнеслі значны ўклад у выспяванне ідэі агульнарускага, уходнеславянскага адзінства; яны рабілі жыццё людзей больш узнёслым і мэтанакіраваным.

### Храналогія

**862 г.** – першыя летапісныя звесткі пра г. Полацк і яго валасць. Пачатак дзяржаўнасці на беларускіх землях.

**980 г.** – першае летапіснае паведамленне пра самастойныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі – Полацкую зямлю і Тураўскае княства; захоп Полацка наўгародскім князем Уладзімірам Святаслававічам, забойства полацкага князя Рагвалода, паланенне Рагнеды.

**984 г.** – паход кіеўскага князя Уладзіміра Святаслававіча на радзімічаў.

**1019 г.** – першыя летапісныя звесткі пра г. Бярэсце (Брэст).

**1067 г.** – першыя летапісныя звесткі пра г. Менск (Мінск).

**1157 г.** – аддзяленне Тураўскай зямлі ад Кіеўскай дзяржавы.

**Пачатак XIII ст.** – пачатак барацьбы, перш за ўсе Полацкага княства, з крыжакамі.

## *Літаратура:*


1. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў [і інш.]. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 1994. – С. 51–113.
2. Тарасаў, К. Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны / К. Тарасаў. – Мінск: Полымя, 1994. – С. 19–23.
3. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 5–17.
4. Ковкель, И.И. Исторрия Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И.И. Ковкель, Э.С. Ярмусик. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 8–19.
5. Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь: IX–XIII стст.: вучэб. дапам. / Э.М. Загарульскі. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 240 с.
6. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / Рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 2000. – С. 123–330.
7. Стралец, М.В. Асноўныя этапы гісторыі беларуска-нямецкіх сувязяў / М.В. Стралец, М.А. Коршак. – Брэст: Выдавец С.Б. Лаўроў, 2000. – С. 4–6.
8. Коршак, М.А. Базавая тэрміналогія па гісторыі Беларусі (у дапамогу настаўнікам і вучням сярэдніх школ, выкладчыкам і студэнтам ВНУ) / М.А. Коршак, М.В. Стралец. – Брэст: Выдавец С.Б. Лаўроў, 2001. – 40 с.
9. Штыхаў, Г.В. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі / Г.В. Штыхаў. – Мн.: ВТАА «Права і эканоміка», 2002. – 94 с.
10. Гісторыя Беларусі: падруд. у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Выш. шк., 2003. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, І.Л. Качалаў [і інш.]; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2003. – С. 44–74.
11. Трещенок, Я.И. История Беларуси. – Ч. 1: Досоветский период: учебное пособие. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2003. – С. 24–38.
12. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі / С.А. Парашкоў. – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2004. – С. 13–51.
13. Чигринов, П.Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие / П.Г. Чигринов. – 2-е изд., перераб. и доп. – Мн.: Выш. шк., 2004. – С. 13–44.
14. Козел, А.А. Философская мысль Беларуси: учеб. пособие / А.А. Козел. – Мн.: Амалфея, 2004. – С. 5–62.
15. Гісторыя Беларусі ў табліцах і схемах. Са старажытных часоў да сучаснасці / Аўт.-склад. Л.М. Нагорная, А.В. Цімашэй. – Мн.: ТАА «Юніпрэс», 2004. – С. 8–11.
16. Баюра, А.Н. История Беларуси в контексте мировых цивилизаций. Структурно-логические схемы: пособие / А.Н. Баюра. – Брест: из-во БрГТУ, 2006. – 60 с.
17. Кузняцоў, І.М. Гісторыя Беларусі. Вызначэнні. Табліцы. Схемы. Лічбы. Даты / І.М. Кузняцоў. – Мн.: «Радыёла-плюс», 2006. – С. 11–25.
18. Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В. Стралец, Л.Ю. Малыхіна. – Брэст: Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт», 2007. – С. 20–30.
19. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): вучэб. дап. / В.И. Галубовіч [і інш.]; пад рэд. В.І. Галубовіча і Ю.М. Бохана. – Мінск: Сучасная школа, 2007. – С. 38–61.
20. Стралец, М.В. Асновы дыпламатычнай і консульскай службы: курс лекцый. Вучэбнае выданне / М.В. Стралец. – Брэст: БрДТУ, 2008. – С. 28–40.
21. Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г.: вучэб. дапам. / Я.К. Новік, И.Л. Качалаў, Н.Я. Новік; пад рэд. Я.К. Новіка. – Мн.: Выш. шк., 2009. – С. 22–57.

Вучэбнае выданне

Складальнік: Васовіч Сяргей Міхайлавіч

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ І МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПА ТЭМЕ «БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў IX ст. – першай палове XIII ст.»

для студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання ўсіх спецыяльнасцей


Адказны за выпуск: Васовіч С.М.
Рэдактар: Строкач Т.У.
Навуковы рэдактар: Баюра А.М.
Камп'ютарная вёрстка: Баравікова А.А.
Карэктар: Нікітчык Е.В.

Подписано к печати 29.12.2009. Формат 60x84 1/16. Бумага "Снегурочка".
Гарнитура Arial Narrow. Усл. п. л. 2,1. Уч.-изд. л. 2,25. Тираж 75 экз. Заказ № 1178.
Отпечатано на ризографе учреждения образования
«Брестский государственный технический университет».
224017, г. Брест, ул. Московская, 267.